■ Свой погляд

# Людзі, на якіх трымаецца ўсё

**Я жыву ў Беларусі, працую настаўнікам. Мне вельмі падабаецца мая краіна, мой народ і мае вучні. На кожным уроку стараюся прывіць ім пачуццё дабрыні, салідарнасці, адказнасці за свае ўчынкі, хоць апошнім часам і чую, што людзі, як быццам, становяцца горшымі — абыякавымі да чужых праблем, да лёсу краіны. Я з гэтым не згодны, бо сустракаў і сустракаю шмат іншых. Ды і ў тых, хто гаворыць пра людскую чэрствасць, хацеў бы спытаць: адкуль яна ўзялася? Што вы асабіста зрабілі, каб хоць некаму прывіць пачуццё любові да зямлі, да людзей, да Радзімы?**



Гаворка не пра словы ды колькасць прачытаных мараляў — пра канкрэтныя справы, канкрэтныя ўчынкі. Спынюся толькі на трох — рэальных, з майго жыцця.

Летась ранняй вясной (гэта калі на рыбалку рана, а грыбоў ды ягад яшчэ няма) выбраўся я на прыроду, заехаў у лес і адразу ўбачыў легкавы аўтамабіль. Стала цікава, хто прыехаў, што робіць у гэтакі час? Можа, які паляўнічы?

Прыпыніўся, вырашыў паглядзець. Хвілін праз дзесяць на ўскрайку з'явіўся мужчына, але стрэльбы ў яго не было. Замест яе быў... кош, поўны смецця.

У размове высветлілася, што Сцяпан з сям'ёй амаль кожную вясну выязджае ў лес, каб разам пабыць на прыродзе, дапамагчы леснікам. «Бо нам жа тут потым грыбы збіраць», — усміхнуўся ён.

Пакуль мы гутарылі, з лесу выйшлі жонка гэтага грыбніка, яго дачушка. Малая з гонарам паказала мне свае знаходкі: дзве пластыкавыя бутэлькі і тры пустыя пачкі з-пад цыгарэт.

Я падзякаваў дзяўчынцы, яе бацькам і потым усю дарогу думаў пра гэту сям'ю, пра тое, як шмат яна робіць, не робячы прытым нічога асаблівага...

Другі выпадак. Мы, аматары рыбалкі, бываем на розных вадаёмах і амаль усюды назіраем адно і тое ж: калі паблізу ад вады ідзе выпас жывёлы, берагі — падобныя на пустыні.

Дык вось, пад'язджаю я неяк да Дняпра. Здалёку бачу вялікі статак (накшталт калгаснага). Настрой адразу ж псуецца: ну, думаю, сарвалася рыбалка... Але ж тут звяртаю ўвагу на тое, што кароў не відаць не толькі каля вады, але нават каля берага.

Мне стала цікава чаму, і я падышоў да пастухоў. Аказалася, што гэта — сям'я цыган. Прыехала сюды з Гомеля на адзін сезон і «электрапастухом» адгарадзіла ўсю прыбярэжную зону. Так што п'юць кароўкі толькі ў адным адведзеным для гэтага месцы...

Калі я расказаў, што раней тут было паіншаму, і нават пахваліў кіраўніцтва гаспадаркі, якое больш беражліва цяпер ставіцца да прыроды, пастухі растлумачылі, што ніякіх спецыяльных указанняў не атрымлівалі. Проста... «Паглядзіце, якая вакол прыгажосць! — «паказаў» мне адзін з пастухоў. — Грэх такую псаваць... Ды і рыбалку добрым хлопцам таксама».

Пачуць такое было вельмі прыемна. А яшчэ больш — ведаць, што людзі (да таго ж прыезджыя) клапоцяцца пра нашу прыроду, шануюць яе хараство.

...Апошні выпадак, пра які хачу расказаць, адбыўся ўжо ў горадзе. На жаль, там нярэдка даводзіцца бачыць, што нехта неахайнага выгляду ў нецвярозым стане сядзіць (а то і ляжыць) на лаўцы. Людзі ў асноўным адварочваюцца ад такіх, праходзяць міма: не цікавяцца, у чым там справа.

Вось і той раз непадалёк ад прывакзальнай плошчы я ўбачыў дзядулю. Ён, прыхінуўшыся спіной да сцяны, сядзеў каля прадуктовай крамы...

Пакуль я набліжаўся, каб спытаць, ці не трэба чым дапамагчы, заўважыў, што мяне апярэдзіла маладая пара.

Высветлілася, што ў дзядулі праблемы з сэрцам... І рукі сутаргай скруціла... А лекі, як на ліха, ва ўнутраной кішэні.

Калі мы дасталі і далі іх, пажылому чалавеку адразу палягчэла і на вачах у яго з'явіліся слёзы ўдзячнасці.

...Тры выпадкі, тры сустрэчы. Не буду рабіць з іх нейкіх глабальных высноў. Проста хачу сказаць, што сярод нас, дзякаваць богу, ёсць людзі, якім не ўсё роўна. І як мне здаецца, менавіта на іх, вось такіх, трымаецца ўсё.

**Анатоль Акірка,**
**настаўнік Навабыхаўскага дзіцячага сада — сярэдняй школы,**
*Быхаўскі раён*

■ Карані

# «МЫ, УСЕ РАЗАМ...»

**Праўду пісаў наш Францыск Скарына: «Як звяры, што блукаюць у пушчы, ад нараджэння ведаюць сховы свае, як птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае, як рыбы, што плаваюць у моры і рэках, чуюць віры свае і як пчолы бароняць вуллі свае — гэтак і людзі да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны, вялікую ласку маюць».**

І сапраўды, у кожнага чалавека ёсць куточак зямлі, дзе ён нарадзіўся і рос, дзе прайшло яго маленства, дзе жывуць (ці жылі) яго родныя ды блізкія, дзе наогул дарагое ўсё — ад нараджэння да скону.

У многіх гэта гарады, пэўныя мікрараёны, кварталы, двары, у многіх...

Ёсць у нашай роднай мове прыгожае слова — «вёска». Яно цёплае, яно... прыцягальнае, як напаленая печка ў халодны зімовы дзень. На жаль, нягледзячы на гэта, знікаюць словы і знікаюць вёскі.

У 60-я гады мінулага стагоддзя ў нашай Каменцы, што на Нясвіжчыне, было 280 хат, жыло 765 чалавек.

Цяпер засталося некалькі бабулек і дзядуль — дай бог ім доўгага жыцця, бо пасля іх адыходу застануцца хіба што могілкі ды вельмі старая драўляная каплічка. Яна ў нас як напамінак пра сувязь часоў і падзей, як сведчанне таго, што нашы продкі дбалі не толькі пра хлеб надзённы, але і пра духоўны. Яны жылі тут, працавалі, потам палівалі родную зямлю, якая дагэтуль славіцца сваімі ўраджаямі. І яны тут паміралі.

Усё так: імёны гэтых працаўнікоў цяпер на помніках.

Яны, вядома ж, з розных матэрыялаў, розныя па сваіх памерах, колерах, коштах... Для ўсіх, хто ставіў іх на магілах сваіх родных і блізкіх, агульнай заставалася хіба што трывога: не дай бог зломяцца, рухнуць старыя дрэвы, і тады...

Праблема ў тым, што іх, гэтых дрэў старых, на нашых могілках было аж 90. Каб спілаваць адно, трэба заплаціць каля 200 рублёў.

На шчасце, сярод ураджэнцаў вёскі знайшліся ініцыятыўныя, неабыякавыя людзі: сёстры Ірына Аляксееўна Зялінка і Лілія Аляксееўна Туціна, былая дырэктар Аношкаўскай школы Таццяна Іванаўна Краўцова, былая калгасніца Ірына Мікалаеўна Мядзведзь.

Дзякуючы ім пра дабрачынную акцыю, пра збор грошай стала вядома не толькі ў Беларусі.

І, трэба сказаць, што людзі правільна ўсё зразумелі, яны адгукнуліся. Першымі былі Антаніна Кузьмінічна Нагорная і Ганна Аляксандраўна Адросік (дай бог ім здароўя), а таксама Міхаіл Рыгоравіч Жаўняровіч і Вячаслаў Мікалаевіч Марук (светлай памяці!)... Нехта ў агульную скарбонку ахвяраваў пяцьдзясят рублёў, нехта — сто пяцьдзясят...

Актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні могілак прыняў старшыня Казлоўскага сельскага Савета Алег Паўлавіч Ярош, тэхнікай дапамог дырэктар ААТ «Новае жыццё» Андрэй Казіміравіч Ратомскі... Мы ўсе разам (хоць, вядома ж, былі і тыя, хто адмовіўся) справіліся, мы не баімся больш ніякіх штармавых папярэджанняў.

А яшчэ мы бачым: што, калі над вёскай узыходзіць сонейка, яно, здаецца, найперш асвятляе могілкі — месца, дзе спачываюць тыя, хто тут нарадзіўся і жыў.

**Антаніна Марук,**
**ураджэнка вёскі Каменка Нясвіжскага раёна**

■ Што бачу

# Пятая нявестка

**...Нічога не скажаш — у Настассі з Лявонам магілка дагледжаная: і помнік на ёй з медальёнамі, і кветак заўсёды шмат, і парадак.**

Яно і зразумела: выхавалі бацькі пяцёра дзяцей, дачакаліся ўнукаў і нават праўнукаў. Адзінае — любоў сваю не пароўну дзялілі: жонак чацвярых сыноў прынялі ў сям'ю — то капейчынай, то кумпячком, то прыглядам за ўнукамі стараліся дапамагчы, а вось пятая нявестка не даспадобы прыйшлася.

І працавітая ж, здаецца, і акуратная, і дзяцей глядзела як след, але ж «не тая», што прыгледзелі сыну...

Вось таму бацькі амаль ніколі не гасцілі ў гэтай сям'і, для прыліку і гады ў рады запрашалі да сябе — нават унукаў.

Так і жылі — дзесяцігоддзямі — блізка і, як быццам, далёка, родныя і, як быццам, чужыя. Парадніліся хіба пасля... смерці.

Справа ў тым, што гора аб'яднала тады сем'і ўсіх сыноў Лявона з Настассяй, яны разам і спраўна наведвалі могілкі, помнік дыхтоўны паставілі, прыгожую абгародку, даглядалі магілы. Але ж з гадамі то праца, то няспраўная машына, то хвароба навалiцца, то ўнукаў трэба глядзець. Не выпадала, карацей, прыйсці на могілкі ні чатыром сынам, ні тым улюбёным нявесткам.

І толькі самая нелюбімая з іх разам з мужам, дзецьмі і ўнукамі не забываюць дарогу да бацькоў: прыходзяць на магілы, прыбіраюць іх, расказваюць нашчадкам, якое прыгожае жыццё пражылі дзяды-прадзеды...

І моляцца за іх, не чакаючы чарговага свята ці гадавіны сыходу.

**Рыта Дрэма,** *г. Астравец*

■ Весткі з месцаў

# Да нас прыляцелі буслы

**З гэтай вясны ў Гомелі пад эгідай ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) пачала работу школа бёрдвотчараў (тых, хто любіць назіраць за птушкамі). Днямі ў ёй адбыліся чарговыя заняткі.**



Уступную лекцыю для слухачоў правялі арнітолаг Зінаіда Гарошка і старшыня рэгіянальнага аддзялення АПБ Раман Хлебін, а пачалася яна каля пешаходнага моста цераз Сож.

Адтуль прысутныя (а ўсяго сабралася каля 60 чалавек, узброеных біноклямі, фотакамерамі, блакнотамі) атрымалі магчымасць паназіраць за вялікай чарадой качак-крыжанак. Далей па маршруце было «знаёмства» з сіняй сініцай, паўзунком, шэрай чапляй, стрынаткай звычайнай... Удзельнікі заняткаў змаглі добра разглядзець птушак, сфатаграфаваць, паслухаць галасы...

Прыемныя сюрпрызы чакалі бёрдвотчараў і на зваротным шляху: нібы спецыяльна для іх у небе кружылі некалькі белых буслоў, на чыстай вадзе Сожа красавалася пара лебедзяў-шыпуноў, а на дрэве весела спявала берасцянка.

**Яўген Шастакоў,** *г. Гомель*

■ У адказ на крытыку

# «Не праехаць і яблыку не ўпасці»

**Матэрыял пад такім загалоўкам з'явіўся ў нумары за 20 лютага. Размова ў ім была пра тое, як жыхары дома нумар 28 на сталічным праспекце Незалежнасці гадамі змагаюцца за бяспечнае перамяшчэнне ва ўласным двары, бо любое святочнае мерапрыемства непадалёку ператварае прыдамавую тэрыторыю ў бясплатную — хоць і забароненую правіламі дарожнага руху — паркоўку.**

Як паведамілі ў Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце, «адміністрацыя Ленінскага раёна горада Мінска вынесла рашэнне ад 13.03.2018 № 306 аб дазволе камунальнаму ўнітарнаму прадпрыемству «Жыллёва-камунальная гаспадарка Ленінскага раёна г. Мінска» правядзенне за кошт грашовых сродкаў жыхароў і суб'ектаў гаспадарання праектна-пошукавых работ і выканання добраўпарадкавання ўнутрыдваровых тэрыторый па адрасе: пр. Незалежнасці, 28, вул. Я. Купалы, 17, вул. К. Маркса, 45 (размяшчэнне дзвюх прылад для абмежавання руху транспартных сродкаў (шлагбаумаў).

У цяперашні час сумесна з ініцыятыўнай групай жыхароў названых дамоў вызначаецца тэхналогія забеспячэння доступу на тэрыторыю каля дамоў і афармляецца неабходны пакет праваўстанаўляльных дакументаў на ўстаноўку шлагбаумаў».

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

■ Фотасерада

# «ГРАЖДАНАЧКА»

Першая жаночая каманда па рэгбі ў Беларусі з'явілася ў 2013 годзе. Тады ж адбыліся і першыя трэніроўкі каманды пад назвай «Гражданачка».

— У гульні самае важнае — гэта адчуваць партнёра, каманду. І вядома ж, трэніравацца, імкнуцца да пастаўленай мэты. Рэгбі — гэта жыццё, — кажуць удзельніцы «Гражданачкі».

Мне давялося наведаць трэніроўку гэтых няўрымслівых дзяўчат і здымаць моманты падрыхтоўкі дружыны да спаборніцтваў.

**Таццяна ТКАЧОВА.**










